Падтрымай "Вясну" на PATREON

Лідэр «Альтэрнатывы» Алег Корбан пакараны штрафам

25.11.2016 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Акцыя "Альтэрнатывы" 10 лістапада ў Мінску.

Лідэр грамадскага аб'яднання «Альтэрнатыва», якое зарэгістравана ў Латвіі, **Алег Корбан** аштрафаваны на 40 базавых велічыняў (840 рублёў) на падставе часткі 1 артыкула 23.34 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях (парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў) за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі 10 лістапада бягучага года. Такое рашэнне 25 лістапада прыняў суддзя суда Ленінскага раёна горада Мінска Андрэй Камушкін.

Як паведамляе прэс-служба ГА "Альтэрнатыва", сваю віну Алег Корбан не прызнаў, растлумачыўшы на судзе, што дзеянні ўдзельнікаў дадзенай акцыі абапіраюцца на артыкул 35 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якая гарантуе права на мірныя сходы, шэсці і пікетавання, якія не парушаюць грамадскі правапарадак. Таксама грамадскі актывіст адзначыў, што сёння ў краіне ў беларускіх грамадзян практычна няма шанцаў атрымаць санкцыю уладаў на правядзенне падобных акцый, таму актывісты вымушаныя дзейнічаць без такога дазволу нягледзячы на магчымыя наступствы.

Нагадаем, 10 лістапада ў падземным пераходзе па праспекце Ракасоўскага ў горадзе Мінску, актывісты «Альтэрнатывы» правялі флэшмоб - была вывешаная 5-ці метровая расцяжка «Новае пакаленне выбірае свабоду!», бел-чырвона-белы сцяг, малюнак герба «Пагоня». Працэс мерапрыемства праходзіў пад песні «Ляпіса» - побач з транспарантам была ўсталяваная партатыўная калонка з музыкай. Акцыя доўжылася 15 хвілін, пакуль не прыбыў міліцэйскі патруль. Праз некалькі дзён, па месцы жыхарства Корбана прыехалі супрацоўнікі міліцыі, якія запрасілі яго ў Ленінскае РУУС для складання адміністрацыйнага пратаколу.

Пастанову суда Ленінскага раёна горада Мінска лідэр "Альтэрнатывы" абскардзіць у вышэйшай інстанцыі не плануе. "Не бачу сэнсу", - тлумачыць Корбан.

Твитнуть





Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"




#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сансетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023


ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY